Мовазнаўства

А.А.КОЖЫНАВА

ІДЭЯ ЦЭЛАГА Ў ТВОРАХ КІРЫЛЫ ТУРАЎСКАГА

Кожная філасофская сістэма вызначае свае адносіны да паняцця цэлага і ягоных частак. Можна сцвярджаць, што часткі – гэта нешта першапачатковае, асноўнае, а цэлае – другаснае, вытворнае, што ўзнікла з частак. Цэлае можна зразумець толькі ў яго суадносінах з элементмі, на якія яно падзяляецца. Пры супрацьлеглым падыходзе да праблемы цэлае ўспрымаецца як нешта асноўнае і самадастатковае, для разумення якога не патрэбны аналіз асобных частак. Прыхільнік такога вучэння ўяўляе ўвесь сусвет як адзіны і непадзельны, і менавіта ад гэтага адзінства трэба пачынаць вывучэнне яго складаючых[1].

Зразумела, у тэкстах Кірылы Тураўскага мы не знойдзем прамога тлумачэння паняцця цэлага, як і кожнага іншага філасофскага паняцця, паколькі яго казанні і малітвы выконваюць зусім іншыя камунікатыўныя функцыі. Аднак прызнаць тэксты тураўскага прапаведніка зусім свабоднымі ад падобных разважанняў нельга, паколькі ўсе яны нясуць на сабе адбітак філасофскіх канцэпцый старажытных кападакійцаў і іх паслядоўнікаў, чые творы, як вядома, ахвотна выкарыстоўваў Кірыла Тураўскі. Да таго ж, мова робіць свой адбітак на тэкставай структуры, рэалізуючы семантычныя адносіны, што захоўваюцца ў глыбіні яе сістэмы, у вытоках значэння слова.

Цэлае, сапраўды, не драбіцца ў тэкстах Кірылы Тураўскага на элементы. Аднак сама ідэя цэлага высвятляе вельмі цесную сувязь з іншымі ідэямі, утвараючы складаныя семіятычныя канструкцыі. Цікава, што ў некаторых гэтых канструкцыях выяўляюцца пэўныя заканамернасці.

Перш за ўсё, цэлае рэалізуецца ў складзе ідэі лячэння і збаўлення, паколькі лексема з коранем цѣл- знаходзіцца ў вытокаў словаўтваральнага гнязда, якое складаюць лексемы и(с)цѣлити, ищѣлитель, ищѣльба, ищѣлние, ищѣлавати, и(с)цѣлѣти, и(с)цѣлати, цѣлитель, цѣлние, цѣлити. Такое выражэнне ідэі лячэння займае вялікую частку прасторы тэкстаў Кірылы Тураўскага, напрыклад – *кго же нынѣ Христосъ благы и чловѣколюбець словомь ищѣли* (Кір. Тур. 1, 36), *къ Тебѣ прибѣгая вѣрою, душевныхъ и тѣлесныхъ язвъ исцѣления прошю* (Кір. Тур. 2, 288), *ощутивъ язву не исцѣльну, взыскахъ врача на земли и не обрѣтохъ* (Кір. Тур. 2, 254).

Сувязь ідэй цэласнасці і здароўя зразумелая і не патрабуе дадатковага тлумачэння, яна неаднаразова пастуліруецца ў тэкстах тураўскага прапаведніка, напрыклад – *можеши во мя исцѣлити и отъ сего часа здрава створити отъ Бога даною ти благодатью* (Кір.Тур.2, 304). Дарэчы, гэтая сувязь рэалізуецца не толькі ў славянскіх мовах – ням. *heil* 'цэлы', *heilen* 'лячыць'.

Сувязь паміж здароўем і цэласнасцю праследжваецца таксама пры аналізе прывітанняў у індаеўрапейскіх мовах. Гот. *hails*, англ.-сакс. *wes hal!*, якія выкарыстоўваліся ў якасці прывітання, звязанае з імі суч. англ. *hail* 'вітаць'; узыходзяць да і.-е. *kagh-//kogh-*, таксама, як і слав. **cel-*[2]. Гэты корань выкарыстоўваецца ў лексеме целовати, якая ў старажытнаславянскай мове магла выступаць ў значэнні 'вітаць' – *начѧша цѣловати и глѫще радоуися ц҃рю июденскъ* (Остр., Мк. 15, 18). У сучаснай жа рускай мове ў гэтым значэнні функцыяніруе лексема *здравствуйте*.

Аднак у славянскай лексемы съдравъ могуць назірацца вельмі цікавыя сувязі. Гэтая лексема ўзыходзіць да «праслав. *sъdorvъ, дзе sъ = ст.-інд. su 'добры'... і *dorvo-, звязанага чаргаваннем з *дрэва*, г.зн. 'з добрага дрэва'»[3]. Пра дрэва, што лечыць і выратоўвае, гаворыцца ў візантыйскіх казаннях, дзе гэтая функцыя яму надаецца праз распаўсюджаную ў старажытных текстах метанімію 'дрэва – крыж', пар. у Грыгорыя Багаслова – смрьти же распѧтьє(м) и къ *древу* простретьє(м) руку *извраченa*[4]; у Іаана Златавуста – повѣшенъ быстъ на дрѣвѣ да бывъшыи древыє грѣхъ *дрѣвомъ* чловѣком *ищѣлитъ* (Супр., 482). Дрэва ў грэчаскім арыгінале казанняў наываецца ξυλον. У традыцыі Святога Пісання το ξυλον της ζωης – дрэва жыцця, адно з увасабленняў сусветнага дрэва, якое з'яўляецца адначасова і універсальнай мадэллю сусвету і ягоным першавытокам. Такім чынам, праз ідэю сусветнага дрэва цялесная цэласнасць здаровага, выратаванага чалавека звязваецца з сусветам, які падаецца не ў асобных частках, а як адзінае цэлае.

Кірыла Тураўскі, аднак, не выкарыстоўвае дрэва ў якасці інструмента лячэння, а праводзіць паралель паміж раскрыжаваннем і збаўленнем. Ён дакладна экстрапаліруе пакуты Хрыстовы на асабістае выратаванне чалавека, што выражаецца ў амаль што поўным паўтарэнні лексічных сродкаў пры апісанні першага і другога – но, насъ ради *страсть* принмъ, исцѣли *страсти* сердца моего... солнце въ *тьму* преложивъ, *язву* копиемъ въ ребра принмъ, *тьму* ума моего просвѣти и великую *язву* грѣховъ уврачюй (Кір. Тур. 2, 325).

Тым не меньш, у казаннях Кірылы Тураўскага таксама назіраецца паралель паміж вяртаннем здароўя і светабудовай. Распачынаючы выратаванне расслабленага, Хрыстос нагадвае пра стварэнне сусвету – тебѣ всю тварь на работу сътвори(х), нбо и земля тобѣ служита: ѡно влагою, а си плодомъ. Тебе ради, слнце свѣтомъ и теплотою служить, и луна съ звѣздами нощь обѣляютъ. Тебе дѣля ѡблаци дъждемь зе(м) напаяю(т): и земля всяку траву сѣмениту и древа плодовитаа на твою службу въздращаю(т). Тебе ради рѣкы носятъ, и пустыни звѣри питаютъ. И глши: чл҃вка не имамъ; и кто ѥстъ мене вѣрнѣѥ чл҃вкъ, ꙗко не солгахъ ѡбѣта въчлвѣченыꙗ моѥго (Кір.Тур.1, 39). Значыць, аднаўленне здароўя і суцельнасці чалавека ажыццяўляецца праз аднаўленне цэлага свету, ці, лепей сказаць, свету як цэлага. Гэтая паралель ідзе каранямі глубока ў мінулае чалавечай свядомасці – М.Эліадэ, у прыватнасці, прыводзіць шматлікія прыклады таго, як пры лячэнні чараўнік выкладае касмагонію ці стварае паводле ложка хворага *imago mundi* (вобраз свету)[5]. Зразумела, што Кірыла Тураўскі звязваў гэты фрагмент зусім з іншай функцыяй – ён яшчэ раз хацеў падкрэсліць усемагутнасць, сілу Госпада.

З вяртаннем здароўя звязана не толькі крэацыя сусвету, але і стварэнне чалавека. Як ужо гаварылася, лексема цѣлъ ужываецца для абазначэння здаровага стану арганізма чалавека, напрыклад, у наступным фрагменце – цѣлъ ѥси кто(м) не згрѣшан (Кір.Тур.1, 41). Выратаваны ж расслаблена тлумача фарысеям: но иже мя створи цѣла, то мнѣ ре(че): въстани, возми ѡдръ свои, и ходи, и се ѥсмь в҃сь здравъ (Кір.Тур.1, 41). У апошнім фрагменце цѣлъ набывае значэнне 'увесь'. Кірыла Тураўскі словамі свайго героя зноў рэалізуе ідэю таго, што сапраўды вылячыць можа толькі крэатар, тварэц усяго сутнага.

Паміж ідэямі сілы і суцэльнасці таксама можна знайсці сувязь. У Евангеллі паводле Лукі ёсць наступны верш – сила из него исхождааше и цѣлѣаше (Мар., Лк. 6, 19). Творы Кірылы Тураўскага не даюць прамой паралелі, аднак у іх можна вылучыць наступныя фрагменты – смердящую душу мою страстьми вашимъ заступлениемъ исцѣлите, и сердце, колеблющеся отъ неприязни, утвердите (Кір.Тур.2, 357); како ти ся, брате, жилы укрѣпиша и теленыꙗ уды утвердиша (Кір.Тур.1, 40). Гэтыя фрагменты даюць магчымасць устанавіць адпаведнасць паміж лексемамі исцѣлити, укрѣпити, утвердити.

Лексемы з коранем *krep-* у многіх славянскіх мовах (рускай, украінскай, балгарскай, сербскай, словенскай) маюць значэнне, у якое ўваходзіць семантычны кампанент 'сіла'. Этымалагічна гэты корань традыцыйна звязваюць з уэльс. *craff* 'моцны', ст.-в.-ням. *kraft* 'сіла, моц'[6]. Непасрэдную сувязь каранёў крѣп- і сил- знаходзім у наступным фрагменце малітвы Кірылы – Зижителю мой, дай же ми крѣпость и силу, постави нозѣ мои на камени покаания, очисти душю мою отъ всякыя скверны (Кір.Тур.2, 322). Большасць славянскіх моў таксама звязвае абазначаную вышэй семантыку з уяўленнем менавіта чалавечай моцы,

здаровай жыццёвай сілы, пар. рус. *крепкий* 'цвёрды, трывалы, здаровы, моцны, надзейны, верны'[7].

Тут цікава будзе зазначыць, што з разуменнем жыццёвай сілы ў славянскіх мовах першапачаткова звязвалася лексема **věkъ*, роднасная літ. *viekas, vieka* 'сіла', і.-е. **weik* 'энергія', гот. *weihan* 'ваяваць', лат. *vincere* 'перамагаць'. Наяўнасць падобнай семы пацвярджаецца таксама і тым, што лексема вѣкъ тлумачыла грэч. 'αιων 'жыццёвая сіла', звязаная са ст.-інд. *ayu* 'жыццёвая сіла, малады, поўны сіл', лат. *iuvenis*, слав. *junъ* 'малады, поўны сіл', і.-е. **yeudh-* 'ваяваць'. Таму ў рускай мове ўзнікла лексема *увечить* 'пазбаўляць жыццёвай сілы, здароўя'. Зразумелым таксама здаецца метанімічны перанос 'жыццёвая сіла' – 'прамежак часу, звязаны з жыццём чалавека' – 'прамежак часу'[8]. Такім чынам, у нас узнікае ўяўленне пра сувязь сілы з часам.

Паняцці, выражаныя каранямі *krep-* і *tvrd-* цесна звязаныя паміж сабою. Для пераканання ў гэтым дастаткова паглядзець тлумачэнне рус. *крепкий,* бел. *крэпнуць* 'дранцвець', а таксама параўнаць наступныя фрагменты з малітваў Кірылы Тураўскага, дзе словы з гэтымі каранямі сустракаюцца ў амаль што ідэнтычных кантэкстах – **Зижителю мой, дай же ми крѣпость и силу, постави нозѣ мои на камени покаания** (Кір.Тур.2, 322) і **поколебавый отъ основания землю и камение рассадивъ, утверди мя на камени вѣры Твоея** (Кір.Тур.2, 325). Гэтыя паняцці таксама аб'ядноўваюцца агульнай семантычнай схемай, якую можна ўбачыць пры аналізе іх этымалогіі.

Лексемы з коранем *tvrd-* узыходзяць да і.-е. **tuer-* 'захапляць, ахопліваць, абгароджваць', сюды ж належыць літ. *tvérti* 'захапляць, ахопліваць, абгароджваць' і 'фарміраваць', ц.-сл. творъ 'форма', ст.-рус. творъ 'вобраз', г.зн. знешняя форма[9], пар. бел. *твар,* польск. *twarz* з тым жа значэннем. Параўнаць можна таксама рус. *творог,* які паўтарае развіццё лат. *formaticum*, фр. *fromage* 'сыр'[10]. Такім чынам, паняцце цвёрдасці звязваецца з паняццем формы. У сваю чаргу лексемы з коранем *krep-* звязаны з паняццем формы праз ст.-інд. *krp-* 'форма, прыгажосць, прыгожы выгляд', авест. *kə̄ʔfš, kə̄hrp-* 'форма, фігура, выгляд', пар. таксама лат. *corpus* 'цела'[11]. Тут можна нагадаць, што «прастора ёсць форма целеснасці»[12], і звязаць форму з прасторай. Прастора і час, пра які гаворка ішла вышэй, – дзве формы існавання матэрыяльнага (і, як цяпер лічаць, ідэальнага) сусвету. Мы зноў вяртаемся да пабудовы *imago mundi.* Нездарма Гасподзь у цытаваных фрагментах называецца як Дэміург – **Зижителю мой,** таксама – **поколебавый отъ основания землю.**

Трэцяя рэалізацыя ідэі цэлага, якая нагадваецца тэкстамі Кірылы Тураўскага – гэта рэалізацыя цэласнасці як чысціні – **нѣсть во мнѣ части цѣлы, ни мѣста чиста** (Кір.Тур.2, 278); **исцѣли болѣзнь сердца моего, уврачуй струпы душа моея, ... очисти помыслы чувства моего** (Кір.Тур.2, 308). Сувязь паміж чысцінёй і здароўем таксама зразумелая, пар. у Евангеллі паводле Марка – **абие отиде проказа отъ него і чистъ бысть** (Мар., Мк. 1, 42). Яшчэ адзін цікавы прыклад пазначанай сувязі можна знайсці, параўнаўшы малітвы Кірылы са старэйшай польскай малітвай. Кірыла Тураўскі, звяртаючыся да Багародзіцы, называе яе наступным чынам – **радуюся и уповаю къ Тебѣ *Чистая.* Тя во заступницу имамъ и очищение; *пречистыя* Матере Твоея Владычиця нашея Богородиця.** У польскай малітве знаходзім іншы зварот – ***Zdrowa Marja, dziwnie jeś poczęła Syna***[12]. Але ўзнікае яшчэ адно пытанне – ці не звязаны і тут паняцці чысты і здаровы з паняццем цэлы? Кірыла Тураўскі піша – **въскри(с) цѣлымъ печатемъ оу гроба, тако во рожися не вреди мт҃рнѧ дв҃ства печати** (Кір.Тур.1, 32-33), такі ж фрагмент можна сустрэць у Іларыёна – **яко Бъ изиде, печати цѣлы сохранивъ**[13]. У чэскіх казаннях пра дзявочую чысціню Божае Маці гаварыцца як пра цэласнасць – *(Maria) ostavši v dievčiej czielosty* ці *v panenské celosty*[14].

Чысціня дасягаецца абмываннем грахоў і немачаў – **крещеннемъ омываеши прародительныя грѣхы и покаяниемь очищаеши душевную скверну.** Дзеяслоў **омывати** узыходзіць да і.-е. кораня **meu-/mu-* 'вільготны, мыць'. Гэты корань мае свае дэрываты ў шмат якіх індаеўрапейскіх мовах, дзе многія з іх маюць значэнне 'прыгожы', якое вынікае са значэння 'вымыты' – н.-ням. *moi(e),* нідэр. *mooi*, лац. *mundis*[15]. «Вянцом семантычнай дэрывацыі гэтага раду з'яўляецца лац. *mundis* 'мір, сусвет', першапачаткова – ужыванне ў гэтым новым значэнні слова *mundis* са значэннем 'аздоба'...: семантычнае новаўтварэнне *mundis* і

'аздоба' > *mundis* II 'мір' на ўзор грэч. κοσμος 'прыгажосць' і 'мір' (як упарадкаваная прыгажосць)» [16]. Такім чынам, ідэя цэлага праз сваю трэцюю рэалізацыю зноў звязваецца з *imago mundi* – вобразам сусвету.

Падводзячы вынікі ўсяго, аб чым гаварылася вышэй, можна сказаць, што сусвет у творах тураўскага прапаведніка паўстае як адзінае цэлае, якое можна ўспрыняць праз пэўныя праявы. Але ў гэтых прыватных праявах мы сустракаем не фрагменты, а зноў цэлае, якое разглядаецца ў іншым, новым ракурсе.

[1] Лосский Н.О. Чувственная, интеллектуальная и мистическая интуиция. М., 1995. С.13.
[2] Pokorny J. Indogermanisches etymologisches Wörterbuch. Bern, 1959. B.1. S.520.
[3] Фасмер М. Этимологический словарь русского языка. М., 1986. Т.2. С.90.
[4] Словарь древнерусского языка. М., 1990. С.80.
[5] Элиаде М. Аспекты мифа. М., 1995. С.38.
[6] Этимологический словарь славянских языков. М., 1985. Вып.12. С.136.
[7] Словарь русского языка М., 1986. Т.2.
[8] Halvová E. // Slavia. 1992. №61. Z.4. S.467.
[2] Pokorny J. Indogermanisches etymologisches Wörterbuch. Bern, 1959. B.2. S.1101.
[10] Там жа.
[11] Этимологический словарь славянских языков. С.38.
[12] Rebowski W. i in. // Slavia Occidentalis, 1991. №52. S.121 і наст.
[13] Срезневский Л.А. // Этимология 1988–1990. М., 1992. С.213.
[14] Gebauer J. Slovník staročeský. Praga, 1970. D.2. S.136.
[15] Караджеева Л.А. // Этимология 1988–1990. М., 1992. С.154.
[16] Трубачев О.Н. // Сравнительно-историческое изучение языков разных семей. М., 1988. С.213.

СКАРАЧЭННІ
Кір.Тур.1 – Сухомлинов М.И. Рукописи графа А.С.Уварова. Спб., 1858. Т.2.
Кір.Тур.2 – Kirill von Turov. Gebete // Slavische Propyläen. München, 1956. B.6.
Супр. – Супраслски или Ретков сборник. София, 1982. Т.2.
Мар. – Ягич И.В. Мариинскоое четвероевангелие. Grac, 1960.

Г.І.БАСАВА

СЕМАНТЫЧНАЯ ДЭРЫВАЦЫЯ НАЗВАЎ АСОБ

Паказчыкамі рухомасці, эластычнасці мовы з'яўляюцца разнастайныя семантычныя пераўтварэнні моўных адзінак. Інавацыйныя працэсы ў галіне семантыкі маюць менш яўны характар, чым лексічныя новаўтварэнні, таму іх выяўленне звязана з пэўнымі цяжкасцямі. Вельмі важнай застаецца і праблема вызначэння сутнасці семантычных інавацый, іх спецыфікі. Вядома, што семантычная дэрывацыя – гэта працэс утварэння новых слоў шляхам змянення семантыкі ўтваральнай адзінкі. Гэты працэс таксама разглядаецца як адзін з відаў элементарнай намінацыі, сутнасць якога заключаецца ў рэалізацыі намінатыўных магчымасцей мовы праз удакладненні значэнняў асобных слоўных знакаў. У выніку гэтага працэсу ўтвараюцца семантычныя інавацыі (неасемемы), да якіх адносяцца ўсе тыпы змен у семантыцы слова пры ўмове захавання яго фонамарфалагічнай формы: адрыў пэўнага значэння полісеманты, перагрупоўка семантычных кампанентаў, змена характару лексічнага значэння і г.д.

Такім чынам, семантычная дэрывацыя разглядаецца як змены ў семантычнай структуры слова, якія ўзнікаюць, з аднаго боку, пад уздзеяннем развіцця пэўных працэсаў у жыцці грамадства, а з другога, – у выніку функцыяніравання і змен парадыгматычных і сінтагматычных сувязей слоў у лексічнай сістэме мовы. Прычыны прадуктыўнасці семантычнай дэрывацыі ў мове заключаюцца ў здольнасці чалавека да асацыятыўнага мыслення, да выяўлення сувязі розных прадметаў, з'яў на аснове якіх-небудзь агульных прымет.

Акрамя таго, фарміраванне новага значэння абумоўліваецца дзвюма групамі фактараў. У аснове першых – супярэчнасці паміж формай, зместам і функцыяй моўнага знака, паміж збыткоўнасцю сістэмы і імкненнем да эканоміі моўных сродкаў, паміж тэндэнцыямі да рэгулярнасці і да экспрэсіўнасці. Другую групу складаюць унутрыслоўныя фактары развіцця значэнняў, да якіх адносіцца ўзаемадзеянне паняццяў і ўяўленняў у значэнні слова.

Усе прыёмы другаснай намінацыі ўваходзяць як паўнапраўныя члены ў разрад сістэмных моўных сродкаў, выкарыстанне якіх садзейнічае паспяховаму выкананню новай функцыі адлюстравання рэальнага свету. Гэтыя прыёмы таксама пашыраюць выяўленчыя магчымасці мовы, а гэта дазваляе з найбольшай паўнатой і экспрэсіяй выразіць тонкія, вельмі індывідуальныя нюансы аўтарскага светаўспрымання. Вылучаюцца наступныя шляхі фарміравання неасемем: